8. Крачковский, Ю.Ф. Быт западно-русского селянина/Ю.Ф. Крачковский. – М.: Изд. имп. Общ-ва истории древностей России при Москов. ун-те, 1874. – 212 с.
9. Киркор, А.К. Литовский язык и литовская мифология/А.К. Киркор//Живописная Россия. Отечество наше в его зем., ист., плем., экон. и быт. Значении: Лит. и Белорусское Полесье: Репринт. воспроизведение изд. 1882 г. – Мн.: БелЭН, 1993. – 27-42.
10. Пахаванні. Памінкі. Галашэнні/рэдкал. : А.С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.] ; уклад. тэкстаў, уступ. артыкул і камент. У.А. Васілевіча; артыкул, сістэматызацыя і камент. напеваў Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск: Навука і тэхніка, 1986. – 615 с.
11. Шейн, П.В. Белорусские народные песни/П.В. Шейн. – СПб.: Тип. П. Майкова, 1874. – 548 с.
12. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. – Мінск: Бел. навука, 2004. – Т. 2: Віцебскае Падзвінне/Т.Б. Варфаламеева, А.М. Боганева, М.А. Козенка. – 910 с.
13. Толстая, С.М. Обрядовое голошение: лексика, семантика, прагматика/С.М. Толстая//Мир звучащий и молчащий: Семиотика звука и речи в традиционной культуре славян/Отв. ред. С.М. Толстая. – М., 1999. – С. 135–148.
14. Никифоровский, Н.Я. Очерки Витебской Белоруссии. Старцы/Н.Я. Никифоровский//Этнографическое обозрение. – 1892. – № 1. – С. 70–105.
15. Серебренников, Ф. Обычаи и обряды крестьян Себежского уезда при крестинах, свадьбе и похоронах/Ф. Серебренников//Памятная книжка Витебской губернии на 1865 г. – СПб, 1865. – С. 75–90.

***Ю.С. Пракоф’ева***

## АСАБЛІВАСЦІ ТРАНСФАРМАЦЫІ ЖАНОЧАЙ ТКАЦКАЙ МАГІІ (ПА МАТЭРЫЛАХ ДАСЛЕДАВАННЯ ВІЦЕБСКА-ПСКОЎСКАГА ПАМЕЖЖА)

Ткацтва – адно з найстаражытнейшых рамёстваў, якое цесна знітавана з жанчынай і жаночым светам. Праведзены аналітычны агляд айчынных і замежных даследаванняў традыцыйнага этнакультурнага і моўнага ландшафту Віцебска-Пскоўскага памежжа[13], а таксама палявых этнаграфічных матэрыялаў і архіўных крыніц паказаў, што найбольш устойлівыя элементы традыцыйных уяўленняў сельскіх жанчын, якія захаваліся ў рэгіёне з канца XIX ст., тычацца цэнтральных намінацый дадзенага рамяства: перапрацоўкі ільну, падрыхтоўчых работ да ткацтва, самога працэсу вырабу палатна. У той жа час, дынаміка развіцця рытуальна-сімвалічнай функцыі тэкстыльных вырабаў і адпаведнага гэтай тэхналогіі інструментарыя ў абрадавых практыках насельніцтва Віцебска-Пскоўскага памежжа ў канцы XIX – пачатку XXI ст. не разглядалася. Дадзенае даследаванне накіравана на выяўленне спецыфікі трансфармацыі рытуальна-магічных дзеянняў сельскіх жанчын Віцебска-Пскоўскага памежжа ў працэсе вырабу тканіны.

Як паказваюць сучасныя палявыя этнаграфічныя матэрыялы, у традыцыйнай карціне свету сельскіх жанчын вывучаемага рэгіёна важнае значэнне мелі прадуцыруючыя магічныя дзеянні, накіраваныя на забеспячэнне высокай ураджайнасці ільну. Дзякуючы спрыяльным прыродна-кліматычным умовам Віцебска-Пскоўскае памежжа прадстаўляла сабой тэрыторыю інтэнсіўнага вырошчвання дадзенай культуры – ключавой сыравіны для ткацкага рамяства. Магічныя дзеянні былі заснаваны на разнастайных відах інтэнсіўнага руху: танцы «*на лён*», падскокі ўгару, катанне на конях, з’яжджанне з гары, падкідванне розных прадметаў. Так, паводле М. Нікіфароўскага, «*на доўгі лён*» зімой дзяўчаты каталіся з горак: чым даўжэй будзе праезд, тым даўжэй вырасце лён [1, с. 240 ]. У Куньінскім раёне Пскоўскай вобласці, у першы панядзелак Вялікага паста пралллі каталіся на прасніцах, «*чтобы лён родился*» (в. Зааўражжа) [2, с. 203]. На Невельшчыне былі занатаваны згадкі пра скокі «*на груду́*»: па заканчэнні жніва або ўборкі ільну, жанчыны ладзілі складчыну на полі, пяклі яечню на вогнішчы, а затым скакалі басанож па вуглях: «*намятём хварасту́ – вот тут мы кастёр и разжигаим <...> и пля́шим. Адни́ женшчины. Зьбе́рутца, их многа зьбе́ретце, бывало, па васемнадцать женшчин, па питна́дцать... Кастёр зажтём <...> там што-нибудь гато́вим – принясём яиц... И там тада́ <...> и пля́шим, и гуля́им. <...> Ой, кастёр гари́ть, и она вакру́г кастра́ пля́шеть басико́м, не абу́вши, басико́м – тётка Авдотья. Бывало, басико́м и пайдёть – раскидаеть всей кастёр нага́ми...*» [3]. Падобны звычай «*потягаши на льну*» зафіксаваны ў в. Аўсішча Вялікалуцкага раёна Пскоўскай вобласці. Калі жанчыны «*собравшись артелей*», ішлі з нівы і спявалі песні (частушкі, «*хто да какую*»), пры гэтым адвязвалі фартухі і білі імі па дарозе: «*как на ярмалках ламаимся! <...> Аб дарогу – пяредникым, ламаимся, пляшем, падухываим! Хто песни играить, хто падухывыить, хто прищёлкывыить!*» [2, с. 40].

[13] Артыкул падрыхтаваны ў рамках праекта БРФФД-РДНФ (ПР) «Традиционный этнокультурный и языковой ландшафт Витебско-Псковского пограничья в конце XIX – начале XXI в.: уровни репрезентации и динамика кросскультурных связей» (дамова № Г16РП-004).

Далейшы працэс апрацоўкі лёну таксама быў прасякнуты мноствам сімвалічных прадпісанняў магічнага характару. Так, мяццё лёну, якое праводзілася з дапамогай спецыяльнай прылады – мяліцы (церніцы), мусілі распачаць дзяўчаты-падлеткі, распусціўшы свае косы, каб лён быў шаўкавістым і гожым [4, с. 287]. У традыцыйнай свядомасці трывала была замацавалася сувязь валакністых раслін з валасамі, бо лён і каноплі ўвасаблялі касу (валасы) і тым самым дзяўчыну.

Актыўна выкарыстоўвалася ў жаночых магічных практыках кастрыца (адходы, якія атрымліваюцца ў выніку перацірання частак сцябла пры мяцці і трапанні валакністых раслін). Так, з мэтай выяўлення ведзьмы, жанчыны на Купалле раніцай перасыпалі вясковую вуліцу «*мяленнем*» ад ільну: *«чыя карова па дарозе ў поле будзе пераскокваць цераз «мяленне» ці спыніцца каля яго і пачне нюхаць, разграбаць капытамі, бадацца і раўсці – гэта верны доказ, што гаспадыня гэтае каровы ведзьма*». І супрацьлеглая працэдура: "*У той час, калі жанчыны ў Чысты Чацвер мнуць лён, каб сабраць кастрыцу дзеля выяўлення ведзьмы, самі ведзьмы таксама мнуць лён да ўсходу сонца і, голыя, сыплюць кастрыцу на вуліцы. Малако ад першай каровы, якая пройдзе па ведзьмінай кастрыцы (на Купалу), пераходзіць да ведзьмы*" [5, с. 35]. Лічылася, што льняную кастру варта вывозіць у «балотныя месцы», і пераважна на балотныя дарогі, бо чэрці баяцца не толькі «кастры», але і яе паху, і пагэтаму не адважацца дaступіцца не да людзей, не да статку [1, с. 119].

Распаўсюджанымі на тэрыторыі вывучаемага арэала былі магічныя прадпісанні і забароны ў сферы прадзення і снавання. Лічылася, што прыгатаванай асновы нельга пакідаць на ноч на двары, бо ў ніткі «*поспешит забраться нечистая сила, чтобы «смоктаць из них человеческую слюну*» [1, с. 100]. Нельга было пераносіць берда праз пагоркі, бо тады тут будуць «*останавливаться дождевые тучи*» [1, с. 101].

На Віцебска-Пскоўскім памежжы добра захавалася традыцыйнае ўяўленне аб забароне працы «у святыя вечары». У першыя дні пасля Нараджэння Хрыстова асабліва нельга было выконваць жаночыя віды работ – прасці кудзелю, ткаць, вышываць, шыць: «*у празьнічныя сьвятыя вечары ні ткалі, ні пралі, ні вязалі. Нельга было. Эта счытаецца – бальшы грэх*»[14]. Паводле народных павер'яў, парушэнне гэтага закона магло адмоўна паўплываць на здароўе і патомства скаціны, на маладзіц, што павінны былі нарадзіць дзіця, і інш: «*если в доме прядутъ или работають над нитками в праздник, то ягнята родятся кривоногими*» [1, с. 100]. На працягу ХХ ст. у вывучаемым рэгіёне даволі распаўсюджаным быў звычай узімку ладзіць «*супрадкі*» («супряжонкі») – сумесныя працы па вырабу ільнянога або ваўнянага валакна. У Вялікалуцкім раёне Пскоўскай вобласці «*ну, супрядки – эта зимой были, эта ани уже разные. Вот этат лён пряли. Я дома и ня пряла, толька на девках. Ўместа сабирались девки – и прядём*» (в. Барок) [2, с. 196].

Паводле традыцыйных уяўленняў, льняное валакно валодае апатрапейнымі якасцямі. Так, у Пушкінагорскім раёне Пскоўскай вобласці зафіксавана наступнае паданне, якое ярка ілюструе гэта: «*дзяўчаты збеглі з ігрышча (гулянкі), а нячыстыя пагналіся за імі; раптам насустрач нячыстым ўпала сцябло лёну і кажа: «Пастойце, аб іх не клапаціцеся. Паслухайце, якую я муку трываю. Вось мяне спачатку пачалі ў зямлю кідаць. Потым пачалі за волоссе цягаць. Потым зрэзалі з мяне галаву, кінулі мяне ў ваду. Потым выцягнулі з вады, пачалі мяне трэсці. Я ляжаў на зямлі супраць сонца. Потым пачалі мяне сукам пароць». Тут певень заспяваў, усё і скончылася*» [6].

Таксама ў якасці абярэга і сродку супрацьдзеяння «нячыстай сіле» жанчыны выкарыстоўвалі верацяно. Так, напрыклад, тры верацёны клалі пад калыску, праз іх пералівалі ваду ад сурокаў. Выкарыстанне ў магічных практыках верацяна тлумачылася, перадусім, самім дзеяннем, што выконвавалася з дапамогаю інструмента, калі з хаатычнай валакністай масы стваралася ўпарадкаваны пачатак – нітка. Акрамя таго, уяўленні пра тое, як «*завярцелася, закруцілася і выкруцілася неба*», а затым «*пачала круціцца і выкруцілася зямля*», дазваляюць змясціць верацяно на месца восі, цэнтра Сусвету ў традыцыйнай карціне свету [7, с. 78]. Верацяном забаранялі дакранацца да дзіцяці, бо, лічылася, што яно перастане расці – стане падобным да верацяна, якое расце ўшырыню, а па вышыні не мяняецца. Падабенства рухаў кручэння верацяна і змяі сталі грунтам іх актыўнага збліжэння ў народных уяўленнях. Так, на Каляды, Благавешчанне верацёны хавалі што далей, бо іх знаходжанне навідавоку абяцала сустрэчу змей улетку («*верацёны вужамі пойдуць у лес*») [1, с. 236]. У легендзе ў змяю-вераценіцу ператварылася верацяно, якім пралі на Каляды і выкінулі, замест таго каб спаліць. Пры лячэнні начніц найчасцей выкарыстоўвалі іголкі і верацяно, якія проста падкладвалі пад калыску дзіцяці [8, с. 56]. Таксама верацяно ўжывалі як сродак ад сурокаў. Дзевяць звязаных разам верацён ставілі над галавой хворага і аблівалі іх замоўленай вадой [6].

У магічных практыках сельскіх жанчын таксама актыўна выкарыстоўваліся ніткі. У працэсе прадзення, нітка прадстаўляе сабой канчатковы, гатовы, «культурны» прадукт – у адносінах да

[14] Запісана аўт. у 2009 г. ад Тарбенка (Гендзелёвай) Г.П., 1940 г.н., в. Тросніца, Полацкага раёна Віцебскай вобласці

прыродных матэрыялаў – льну (канопляў) або воўны. Такім чынам, у ткацкім цыкле нітка была зыходным матэрыялам, з якога атрымліваўся «культурны» прадукт – палатно [9, с. 91]. «Дваістасць» ніткі, адначасовая прыналежнасць «прыродзе» і «культуры» у сукупнасці з шырокім спектрам сімвалічных функцый абумовілі яе шырокае выкарыстанне, як у знахарстве, так і ў чарадзействе. Надзвычайнымі якасцямі надзялялася менавіта суровая – нябеленая, нямытая нітка: *«ад звіху робяць навязкі: на суровай ніцы... завязваюць дзевяць вузельчыкаў (тры на тры); потым трэба звязаць тры вузельчыкі, прачытаць адну або тры «Багародзіцы», пасля гэтага трэба перахрысціцца і абвязаць той ніткаю хворы сустаў, пакінуўшы яе, пакуль яна не парвецца»* [8, с. 548]. Сярод сялян Віцебскай губерніі, быў зафіксаваны спосаб вырабу ніткі, а менавіта прадзенне яе «наадварот» альбо левай рукою: «у *Чисты чэцьвер это сядзеш на парози да ужэ вупрадзеш трохи. Шчэ ж прадзеш да шчэ круциш навуварат, ат тыя нитки вазьмеш от дзе рука балиць»* [11, с. 213]. У Чысты чацвер, паводле запісаў П. Шэйна, *«трэба было ўстаць да ўсходу сонца. Жанчыны бралі грэбень, надзявалі на яго мочку льна і пралі ніткі, якія пасля захоўвалі на працягу года, іх называлі «четверговыми нитками». Гэтыя ніткі мелі перавагу над тымі ніткамі, якія былі напрадзеныя ў іншы час і правай рукой, тым, што мелі лячэбныя якасці, у прыватнасці, ад «опухалі рук»* [10, с. 198]

Магічнымі ўласцівасцямі, паводле традыцыйных уяўленняў, валодала нітка, якой перавязвалі вярбу на Вербніцу, якой перавязвалі рукі нябожчыку, ад веніка альбо выцягнутая з дзяругі [8, с. 49]. Нітка адпаведна магічна садзейнічала “адпаданню барадавак”. З той жа мэтаю нітку закапвалі ў навоз, у каляю на дарозе, у зямлю ў трыццаці трох кроках ад крыжа на ростанях, пад бліжэйшы да хаты камень [8, с. 60].

Такім чынам, аналіз этнаграфічных крыніц і палявых матэрыялаў, зафіксаваных на тэрыторыі Віцебска-Пскоўскага памежжа, паказаў, што трансфармацыйныя працэсы XX – пачатку XXI ст.ст. закранулі не толькі мастацкія і тэхналагічныя складнікі ткацтва, а таксама змянілі сэнсавыя канстанты дадзенай рамеснай вытворчасці. Пераважная частка дзеянняў сельскіх жанчын, скіраваных на дасягненне высокай ураджайнасці лёну, добрай якасці валакна і тканіны, носіць падкрэслена сімвалічны (рытуальны) характар і можа быць патлумачана толькі ў кантэксце асаблівасцяў традыцыйнага светапогляду. Сучасныя інфарманткі сталага веку яшчэ памятаюць назвы традыцыйных тэкстыльных тэхналогій, прызначэнне дэталяў ткацкага станка, хоць рэальна на тэрыторыі вывучаемага рэгіёна ткацкае рамяство ўжо не практыкуецца з 80-х гг. XX ст. (у некаторых мясцовасцях яшчэ раней). У той жа час вясковыя жанчыны ўжо не валодаюць такой паўнатой звестак аб прасторава-часовай арганізацыі работ, сімвалічных функцыях працэсаў вырабу тканіны, якая фіксавалася этнографамі ў канцы XIX – першай трэці XX ст. Гэта можа ўскосна сведчыць аб вымыванні традыцыйных уяўленняў аб рытуальна-сімвалічнай функцыі тэкстыльных вырабаў і адпаведных гэтай тэхналогіі інструментаў з народнай памяці жыхароў Віцебска-Пскоўскага памежжа. Сучасныя ўяўленні, у адрозненне ад зафіксаваных у першай палове XX ст., утрымліваюць вузейшыя вобразы, дзе не так падрабязна тлумачыцца тое, як адбываюцца працэсы вырабу тэкстыльных вырабаў, якімі рытуальна-магічнымі дзяннямі суправаджаюцца. Прычыны «мінімізацыі» традыцыйных уяўленняў, звязаных з тэхналогіяй перапрацоўкі валакна, прадзеннем і ткацтвам, звязаны з агульнай дыфузіяй масавай камунікацыі.

ЛІТАРАТУРА

1. Никифировский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах Витебской Белоруссии/Н.Я. Никифоровский. – Витебск: Губерн. Типо-Литограф., 1897. – 338 с.
2. Народная традиционная культура Псковской области: Обзор экспедиционных материалов из научных фондов Фольклорно-этнографического центра. В 2 т . – П с к ов: Издательство Областного центра народного творчества, 2002. – Т. 1. – 688 с., илл., нот.
3. Жатвенная обрядность, жнивные и яринские обрядовые песни в южных районах Псковской области//Нематериальное культурное наследие Российской Федерации. – [Электронны рэсурс]. – Режым доступа: http://www.culture.ru/objects/368/zhatvennaya-obryadnost-zhnivnie-i-yarinskie-obryadovie-pesni-v-yuzhnih-rayonah-pskovskoy-oblasti. – Дата доступа: 06.08.2016
4. Малоха, М. Лён/М. Малоха//Беларуская міфалогія: Энцыкл. слоўнік. – Мн.: Беларусь, 2004. – С. 287 – 288.
5. Лобач, У.А. Лён і вырабы з лёну ў знахарскіх практыках беларусаў Падзвіння/У.А. Лобач//Мат-лы навук.-практ.канф. па выніках навук.-даслед. работы ў 2004 г. Полацк, 2004. – С. 31 – 38.
6. Шубина, Т.Г. Обработка льна и шерсти, прядение и ткачество/Т.Г. Шубина – [Электронны рэсурс]. – Режым доступа: http://edapskov.narod.ru/pskov/obrlicＨersti.htm#4 – Дата доступа: 16.07.2016
7. Валодзіна, Т.В. Верацяно/Т.В. Валодзіна//Беларуская міфалогія: Энцыкл. слоўнік. – Мн.: Беларусь, 2004. – С. 78 – 79.
8. Народная медыцына: рытуальна-магічная практыка/Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі; уклад., прадм. і паказ. Т.В. Валодзінай; навук. рэд. А.С. Ліс. – Мн.: Беларус. навука, 2007. – 776 с. – (Беларуская народная творчасць)
9. Лысенко, О.В. Метамарфозы одежды в хаосе архаичных форм: модель формирования семантической структуры “народного костюма” в восточнославянской этнокультурной традиции XIX – XX вв./О.В. Лысенко//Мифология и повседневность. Вып. 2. Материалы научной конференции 24 - 26 февраля 1999 года. СПб, 1999. – С. 91.

10. Шейн, П.В. Материалы для изучення быта и языка русского населення Северо-Западнаго края/П.В. Шейн. Т. 2. – СПб.: Тип. Имп. Акад. Наук, 1893. – 715 с.
**11.** Иванов, В.В. Приметы и поверья крестьян Витебского уезда Витебской губернии/Иванов В.В.//Записки Северо-Западного отдела ИРГО. – Вильно, 1910. – Кн.1. – с. 208 – 213.

***Т.Л. Пырова***

## ГЕНДЕРНОЕ НЕРАВЕНСТВО В АКАДЕМИЧЕСКОЙ СРЕДЕ: АНТРОПОЛОГИЯ ОДНОГО СООБЩЕСТВА

Сфера науки и образования в России на сегодняшний момент считается одной из наиболее благополучных в гендерном отношении (Винокурова, 2009). Например, по статистическим показателям, число женщин-студентов в высших учебных заведениях превосходит число мужчин-студентов в аналогичных учебных заведениях. Такая ситуация характерна для России уже не первое десятилетие.

Также традиционно велика численность женщин-ученых среди работников сферы науки. Например, в 2007 году женщин - кандидатов наук, выполняющих научные разработки, было зафиксировано больше половины (Женщины и мужчины России, 2008). Что касается докторов наук, то здесь текущая ситуация не такая «радужная», но наблюдается позитивная динамика к увеличению их количества.

Однако, несмотря на кажущееся благополучие, в сфере науки и образования все же присутствует явный гендерный дисбаланс. Во-первых, он проявляется в концентрации женщин в определенных «женских» отраслях знания: в первую очередь, в гуманитарных областях, где доля женщин составляет более 80% от общего числа обучающихся по специальностям гуманитарного профиля (Женщины и мужчины России, 2008). Многие социологические исследования, например, говорят о том, что в общепринятых «мужских» сферах занятости и «мужских» специальностях женщинам намного тяжелее делать карьеру, как административную, так и академическую (Орешенкова, 2007).

Во-вторых, женщины в академической среде располагаются, в первую очередь, на низших ступенях иерархической лестницы. Это становится заметно, если обратиться, например, к таблицам распределения профессорско-преподавательского состава по полу за 2007 год, на которых видно, что процент женщин среди общего количества руководящего персонала не превышает 20% (Женщины и мужчины России, 2008).

И, наконец, заработная плата женщин в академической среде ниже, чем аналогичная оплата труда у мужчин, что, в целом, является характерным для общей экономической ситуации в стране (Винокурова, 2009). Такие вводные данные дают нам основания для проведения эмпирического исследования, целью которого является рассмотрение специфичной организационной структуры в сфере науки и образования, одного из научных подразделений Высшей школы экономики, на предмет наличия гендерного неравенства и его репрезентации на уровне повседневных практик в академической среде.

**Исследовательские вопросы:** 1) Как гендерное неравенство воспроизводится в академической среде на уровне повседневных практик? 2) Является ли гендерное неравенство доминирующим среди возможных типов социального неравенства, распространенных в академической среде?

**Теоретическая рамка / концепция исследования**

На сегодняшний день исследования по гендерной теории представлены разнообразными концепциями и авторами, однако для нашего исследования мы решили сфокусироваться на перформативной теории гендерной идентичности Джудит Батлер. Понятие перформатива (performative) было заимствовано феминистскими исследователями из философской концепции языка одного из наиболее влиятельных британских философов XX века – Джона Остина. В рамках данной концепции перфомативное высказывание – это высказывание, которое наделено силой осуществления действия.

Согласно перформативной теории гендерной идентичности, истинной природы женщины или истинной природы мужчины, которая вытекала бы из их телесных особенностей, не существует. Гендер является результатом или следствием многократных перформативных действий (performative acts), осуществленных в определенном культурном контексте, а видимость его естественности создается этим многократным повторением. Другими словами, в основе перформативной теории находится внимательный анализ повторяемых формализованных действий (или практик), которые конструируют «пол» и формируют гендерные иерархии, (вос)производящиеся на уровне социальных взаимодействий.

Опорой для такого утверждение являются более ранние теоретические построения в области социологии о возможности социального конструирования реальности (Бергер, Лукман, 1995). Идея конструирования подчеркивает деятельностный характер усвоения опыта. Субъект создает гендерные правила и гендерные отношения, а не только усваивает и воспроизводит их. Гендерные отношения конструиру-